«ЕЎРАБАЧАННЕ-2014»: СКАЖЫЦЕ «СЫ-ЫР»!

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

У студыі, нягледзячы на строгія папярэджанні рэжысёра «не перашкаджаць, інакш выдалю ўсіх лішніх», было вельмі шматлюдна. У натоўпе зацікаўленых мы заўважылі тэлевядучую Алену Спірыдовіч, якая, да слова, назірала за працэсам і ў абодва дні праслухоўвання. «Гэта прафесійны інтарэс, — на хвіліну адарвалася ад займальнага відовішча Алена, — я ж таксама пачынала працу на тэлебачанні з конкурсаў. Таму большасць артыстаў мне добра знаёмыя: і Макс Сапацькоў, і Валерый ДзіДзюЛя, і Юра Вашчук — яны ўсе ў свой час прайшлі праз нашу «Зорную ростань». Наогул, на маю думку, на конкурсах вельмі цікава працаваць: тут усё шчыра і пасапраўднаму, не мае значэння, якім ты быў учора, важна тое, як ты спяеш тут і цяпер. Я не хварэю за кагосьці канкрэтнага, шчыра сімпатызую ўсім і спадзяюся яшчэ, што ў сукупнасці будзе прыгожа — вечарам спецыяльна пагляджу фінал па тэлевізары».

Мы вырашылі зрабіць гэтаксама: па-першае, сам конкурс не толькі музычны, але і тэлевізійны, а па-другое, пасля генеральных рэпетыцый відавочнага фаварыта і разумення таго, што вось яна, «тая самая» песня, у нас так і не з'явілася.

ДзіДзюЛя падчас галасавання скептычна ўсміхаўся.

бадай, упершыню за ўсе беларускія адборы. Але вядучыя шоу Вольга Рыжыкава і Дзяніс Дудзінскі, не разгубіўшыся ні на секунду, запрасілі журы… «дагаласаваць» наўпрост на сцэне, аддаючы кардонныя сэрцы таму ці другому канкурсанту. З лікам 8:0 перамогу атрымаў Юрый Вашчук, ён жа Тэа.

Уся працэдура выклікала буру абурэння ў інтэрнэце (нагадаем, прамая трансляцыя шоу ішла ў тым ліку на сайце eurovision.tv). Маўляў, чаму і як журы прагаласавала двойчы?! «Усё прапісана ў палажэнні аб нацыянальным адборачным туры», — паведамілі ў Белтэлерадыёкампаніі. Сапраўды, у арт. 6 палажэння пазначана: «У выпадку калі 2 і больш удзельнікаў фіналу праекта набіраюць роўную колькасць балаў, пераможца праекта вызначаецца дадатковым адкрытым галасаваннем прафесійнага журы».

Жанет са сваёй сукенкай-трансформерам.

ХТО ГАЛАСУЕ АПОШНІМ

Найпершым сюрпрызам у шоу для многіх чамусьці стала… адсутнасць сярод фіналістаў Аляксандра Саладухі. Так-так, у апошнім прома-роліку артысту ўдалося так заінтрыгаваць і заблытаць гледачоў абяцаннем: «Я буду ў фінале», што за яго ўжо гатовы былі галасаваць!

Другой неспадзяванкі тэлегледачы не ўбачылі, але на артыстаў яна магла паўплываць: у студыі чамусьці было вельмі мала балельшчыкаў. Затое дзівосы, якія рабіліся з гукам, напрыклад, падчас выступлення гурта «Nuteki» ці Макса Лорэнса і ДзіДзюЛі, здаецца, адзначылі ўсе. І здзівіліся: не можа ж быць, каб вопытныя артысты настолькі не траплялі ў ноты? Ці можа — калі перахваляваліся і «перагарэлі»?

…Галоўныя эмоцыі выклікала ўсё ж галасаванне. У першай яго частцы, калі былі падлічаны сімпатыі гледачоў, у лідары выйшлі Лорэнс, ДзіДзюЛя і кампанія з 8746 баламі, другі радок занялі «Nuteki» з 5651 голасам, трэцяе месца і 5088 галасоў гледачы аддалі Тэа (Юрыю Вашчуку). Рашэння журы давялося чакаць значна даўжэй, пакуль выступаў добры дзясятак спецыяльных гасцей. І хоць пастаноўшчыкам шоу асобны «дзякуй» за ўключэнне ў канцэрт беларускамоўных гуртоў «Aura» і «Joanna», усё ж выпрабаванне для нерваў публікі і артыстаў можна было зрабіць крыху меншым.

А 8 суддзяў, якія па чарзе агучвалі, каму аддалі найвышэйшыя балы (12, 10 і 8), стварылі прэцэдэнт. Паводле галасавання журы, на першым месцы апынуўся Тэа з 90 баламі, на другім — Жанет з 80 і толькі на трэцім Макс Лорэнс і ДзіДзюЛя з 52. Пры пераводзе гэтых вынікаў у 12-бальную сістэму і падсумоўванні балаў аказалася, што першае месца занялі адразу двое — Тэа і Макс Лорэнс з ДзіДзюЛем. Такое адбылося, Дзеля справядлівасці адзначым: па-першае, гэтае ўдакладненне з'явілася ў правілах беларускага адбору толькі летась, пасля скандалу з падтасоўкай галасоў у 2012-м і двух гадоў закрытага адбору ў 2011-м і 2010 годзе. А па-другое, абсалютная большасць гледачоў з новымі нюансамі ў падліку галасоў не знаёмая. Няўжо яшчэ да пачатку шоу вядучым нельга было выдаткаваць 2–3 хвіліны, каб расказаць аб іх? Нарэшце, навошта было даводзіць публічную «раздачу славаў» (прабачце, сэрцаў) да канца, прыніжаючы прайграўшых артыстаў, калі для перамогі дастаткова было набраць 5 галасоў журы? Існуе ж у спорце падобнае правіла мінімальнай перавагі: у хакеі авертайм доўжыцца да 1 забітай шайбы, у тэнісе дастаткова выйграць 3 з 5 сэтаў…

Словам, вынікамі галасавання засталіся незадаволены многія — прычым як гледачы, так і самі артысты. І гэта ўжо не першы год запар. Тэндэнцыя, аднак.

ХТО ТАКІ ТЭА І З ЧЫМ ЯГО ЕСЦІ

Усё вышэйсказанае ні ў якім выпадку не адмяняе поспеху Юрыя Вашчука як кампазітара і выканаўцы. І можна доўга спрачацца, прынёс яму перамогу тэлевізійны вопыт (Юрый працуе ў праекце «Наперад у мінулае») альбо 13-гадовая праца ў Нацыянальным акадэмічным канцэртным аркестры пад кіраўніцтвам Міхаіла Фінберга, і наўмысна ці выпадкова яго нумар падобны да кліпа Robin Ticke на песню «Blured Lines». А можа, ролю добрага анёла сыграў бэк-вакаліст Дзяніс Ліс, не без удзелу якога ў 2007-м на «Еўрабачанне» быў абраны Дзмітрый Калдун?.. Тым не менш пагадзіцеся: выканаўца абаяльны і на сцэне трымаецца ўпэўнена, а песня «Cheesecake» жывая і пазітыўная, прычым распавядае яна зусім не пра сырна-тварожны дэсерт, а пра тое, што бывае, калі дзяўчына доўгі час называе свайго каханага «салодкім піражком».

А яшчэ — так, да ведама аматараў грэбліва крывіць вусны: «А хто гэта такі наогул?» — Юрый Вашчук кампазітар, аранжыроўшчык, аўтар песень многіх беларускіх артыстаў і музыкі да кінафільмаў. І тройчы лаўрэат Нацыянальнай музычнай прэміі: сёлета разам з Леанідам Шырыным названы лепшым аўтарам музыкі за кампазіцыю «Беларусь вялікая», пад якую грымеў салют у Дзень Незалежнасці, у 2012 годзе быў названы «Лепшым аранжыроўшчыкам», а ў 2011 годзе менавіта пад творчым псеўданімам Тэа стаў «Адкрыццём года».

«Не чакаў. Але, вядома, спадзяваўся, — зазначыў Юрый Вашчук, калі нервовае напружанне выступлення крыху адпусціла. — Інакш навошта было б выходзіць на сцэну, калі не імкнешся перамагчы?». Выступіўшы аранжыроўшчыкам у песнях яшчэ дзвюх фіналістак адбору, уласную кампазіцыю, як сцвярджае спявак, напісаў за 2 дні і адправіў у апошні дзень прыёму заявак. Затое цяпер небеспадстаўна запэўнівае, што «беларускі чызкейк — самы смачны ў свеце».

Якім будзе яго нумар на «Еўрабачанні», Вашчук пакуль што не загадвае. Здаецца, ён і сам яшчэ не да канца ўсвядоміў, які падарунак (ці які галаўны боль, гэта як паглядзець) зрабіў сабе напярэдадні 31-га дня нараджэння. Затое калегі па сцэне ў сацсетках ужо даюць рэкамендацыі і прапановы. Ніна Багданава зычыць сябру поспеху і раіць разняволіцца, каб перажыць непазбежны ўсплёск негатыву. Георгій Калдун разважае, ці не варта звярнуцца па кансультацыйную дапамогу да тых, хто ўжо дасягаў поспеху ў «Еўрабачанні», — скажам, каманды Украіны ці Азербайджана. А былы кіраўнік Белтэлерадыёкампаніі Уладзімір Максімкаў наогул склаў дастаткова падрабязны і паслядоўны прадзюсарскі план дзеянняў. І вось што дзіўна: кожны раз пасля адбору знаходзіцца мноства людзей, якія ведаюць, як трэба. А прадстаўнікі Беларусі, як памятаем, вышэй за 6-е месца на «Еўрабачанні» так і не ўзняліся. Як кажуць, каментарыі залішнія.

Усе вынікі галасавання, у тым ліку балы ад гледачоў і пратаколы членаў журы, можна знайсці на сайце Белтэлерадыёкампаніі tvr.by ў раздзеле «Праекты. Еўрабачанне 2014».

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.
Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Тым часам

Паўторнага галасавання журы можна было пазбегчы, калі б адразу правільна былі падлічаны балы, мяркуюць фіналісты адбору, удзельнікі гурта «Switter boys». І прыводзяць у якасці доказу змешчаную на сайце Белтэлерадыёкампаніі табліцу балаў ад гледачоў і журы. Паводле яе, першае месца, набраўшы аднолькавую колькасць балаў, дзеляць паміж сабой Тэа і Макс Лорэнс з ДзіДзюЛем, другое — Жанет і «Switter boys», а на трэцім — адразу і Анастасія Малашкевіч, і «Nuteki», і Таша Odi. «Нам у галасаванні журы камп'ютар даў 7 балаў, а Лорэнсу з ДзіДзюЛем 8. Але чаму — у нас жа больш высокія ацэнкі ад журы?» — здзіўляюцца артысты.

Тлумачэнне гэтаму факту, здавалася б, ёсць у правілах адбору: пры аднолькавай суме балаў больш высокае месца займае той канкурсант, хто атрымаў больш высокую ацэнку ад старшыні журы. Але старшыня БТРК Генадзь Давыдзька з аб'ектыўных прычын з ліку суддзяў выбыў. Тады, можа, камп'ютар спрацаваў «у алфавітным парадку»? Афіцыйнага тлумачэння на гэты конт на момант падрыхтоўкі публікацыі мы не атрымалі. А вось колькасць арфаграфічных памылак у афіцыйным, заўважым, дакуменце прапануем вызначыць чытачам самастойна.

Сводная ведамость баллов, полученных участниками финала Национального отборочного тура Международного телевизионного конкурса песни "Евровидение-2014" по итогам голосования профессионального жюри и зрительского голосования.

		Данильчо Г.В.	Тозаканов А.Г.	Мальцев М.В.	Грищенков Е.И.	Рязанов В.П.	Мартынов Э.А.	Алена Ланская	Максимкаў А.Н.	Ракуцкий М.Н.	Итого сумма баллов по итогам профессионального жюри	количество баллов по итогам зрительского голосования	количество голосов по итогам зрительского голосования	количество баллов по итогам профессионального жюри и зрительского голосования	итоговая сумма баллов по итогам профессионального жюри и зрительского голосования	МЕСТО
1	Наталья Тамело	6	5	0	6	0	5	0	5	2	29	4	668		4	5
2	Группа "Нутаки"	0	0	0	0	0	0	1	0	4	5	0	5651	10	10	2
3	Артем Михаленко	0	0	0	0	0	0	0	0	0	0	0	1844		0	8
4	Матвей Купер и группа DUX	0	2	1	1	3	0	0	0		7	0	2120		1	7
5	ТЕО	12	12	12	10	12	8	12	12		90	12	5088	8	20	1
6	Дарик	5	6	6	7	4	10	1	6		45	7	2421	2	9	4
7	Елена Синявская	0	1	4	0	7	0	0	3		15	3	1122		3	6
8	Алена Мощенко	2	0	2	2	1	4	2	0		13	1	1841		1	8
9	Жанет	10	10	10	12	10	12	8	8		80	10	2800	3	13	2
10	Анастасия Малашкевич	1	4	7	5	8	0	4	1		30	5	3370	5	10	3
11	SWITTER BOYS feat. KATE&VOLGA KAROL	4	3	8	4	6	7	10	10		52	7	4389	6	13	2
12	Группа NAPOLI	3	0	0	0	0	0	3	3	5	14	2	4847	7	9	4
13	Макс Лорэнс & Дзідзюля	7	7	5	8	5	8	6	7	7	52	8	8746	12	20	1
14	Таша Odi	8	8	3	3	2	2	6	0		32	6	2936	4	10	3

«ТАМ ЛІРА ДЗІЎНАЯ ГУЧАЛА»



Па гарызанталі: 1. Геніяльны польскі кампазітар і піяніст, заснавальнік нацыянальнай музычнай класікі. **4.** Паўтарэнне мелодыі рознымі галасамі, якія ўступаюць паслядоўна адзін за другім. **10**. Украінскі шматструнны музычны інструмент з шырокім грыфам. **15**. Французскі кампазітар, стваральнік балета «Карсар» на сюжэт паэмы Д. Байрана. **16**. Многагалоссе. **17**. Музычны харавы твор на тэкст каталіцкага набажэнства. **20**. Адзін з арганізатараў і выкладчыкаў беларускай кансерваторыі. **21**. Міжнародны фестываль мастацтваў «Славянскі…», які штогод праводзіцца на віцебскіх падмостках. **22**. Венгерскі даследчык музычнага фальклору балканскіх краін. **25**. Буйнейшы французскі кампазітар XVIII ст., аўтар «Трактата аб гармоніі». **26**. Музычны відэаролік. **27**. Паслядоўнае паўтарэнне адной музычнай тэмы некалькімі галасамі. **28**. Беларускі графік, аўтар станковых твораў «Песні заходніх славян». **33**. Рускі народны танец. **34**. Гераіня аперэты І. Кальмана «Баядэра». **37**. Адзін з асноўных жанраў інструментальнай музыкі. **40**. Выканальніцкі … песні. **41**. Жаночы вакальны квартэт, створаны ў 1966 годзе пры Дзяржаўным народным хоры Беларусі па ініцыятыве Г. Цітовіча. **42**. Аўстрыйскі горад, дзе знаходзяцца дамы-музеі Л. Бетховена, В. Моцарта, Ф. Шуберта і іншых славутых кампазітараў. **45**. Стваральнік оперы «Дзекабрысты». **46**. Пісьмовая фіксацыя музыкі. **47*.** Частка музычнага твора, у якой вельмі хутка і паслядоўна чаргуюцца высокія і нізкія ноты. **48**. Народная артыстка Беларусі, з 1970 года — салістка Дзяржаўнага тэатра музычнай камедыі.

Па вертыкалі: 2. Закончаны па пабудове эпізод у оперы, араторыі, кантаце, які выконваецца спеваком з аркестрам. **3.** Узор, стандарт для параўнання. **5.** Невядомы аўтар музычнага твора. **6.** Піяніст, кампазітар, музычны пісьменнік з Берасцейшчыны, творчасць якога звязана з мастацкім жыццём Беларусі і Польшчы. **7.** Стваральнік сімфанічнай паэмы «У Тураўскай пушчы». **8.** Калектыў музыкантаў, згуртаваных народным артыстам Беларусі дырыжорам М. Фінбергам. **11**. Знакаміты беларускі і французскі мастак, які стварыў сцэнаграфіі балетаў «Алека» на музыку П. Чайкоўскага і «Жар-птушка» І. Стравінскага. **12**. Эмблема музыкі (гл. фота). **13*.** Балет Я. Глебава. **14**. Жанр музычнага твора М. Рымскага-Корсакава «Снягурачка», прэм'ера якога на беларускай сцэне адбылася ў 1981 годзе. **18*.** Савецкі кампазітар, драматургічнае майстэрства яго асабліва яркa праявілася ў музыцы манументальнага балета «Спартак». **19*.** Танцоўшчыца з Палесся, у 1785–1794 гг. выступала на каралеўскіх сцэнах і ў Нацыянальным тэатры Варшавы. **23**. Беларуская спявачка, што стварыла глыбокія, запамінальныя вобразы ў рэпертуары Нацыянальнага тэатра оперы. **24*.** Музычная навучальная ўстанова. **29**. Тэрмін, які ў тэорыі музыкі прымяняецца для характарыстыкі рытмічных груп ці матываў. **30**. Савецкі кампазітар, стваральнік шматлікіх песень на словы М. Ісакоўскага, якія сталі народнымі. **31*.** Музычна-сцэнічнае прадстаўленне вясёлага, жартаўлівага характару. **32**. Французская пісьменніца, аўтар рамана «Ці любіце вы Брамса?». **35*.** Род музычнага мастацтва, заснаванага на паўімправізацыйных формах народнай творчасці, узнік у канцы XIX ст. на поўдні ЗША. **36**. Опера Ж. Масэнэ. **38*.** Першы друкаваны твор М. Багдановіча пра вандроўнага скрыпача, што абуджаў народ ад цяжкага сну. **39*.** Музычны інтэрвал. **43**. Заключная частка музычнага твора. **44*.** Вандроўны паэт-спявак.

Склаў Іосіф КАРПЫЗА, *г. Ляхавічы.*

АДКАЗЫ НА КРЫЖАВАНКУ

Па гарызанталі: 1. Шапка. 4. Канон. 9. Скрыпка. 10. Бандура. 15. Аўра. 16. Поліфанія. 17. Месса. 20. Анадаўр. 21. Баазар. 22. Бэр-так. 25. Рамо. 26. Кліп. 27. Фуга. 28. Лосс. 33. Трамак. 34. Аўра. 37. Соната. 40. Плач. 41. «Кулацкіка». 42. Вена. 45. Шапорын. 46. Натальля. 47. Пасаж. 48. Гаўда.

Па вертыкалі: 2. Арыя. 3. Этапон. 5. Аванпік. 6. Оцуда. 7. Аксакоў. 8. Аркестр. 11. Шагал. 12. Ліра. 13. «Мара». 14. Кажа. 18. Хачатурян. 19. Маніфікат. 23. Конас. 24. Шкона. 29. Стана. 30. Захарэй. 31. Камедыя. 32. Сагав. 35. Джаз. 36. «Таіс». 38. «Мужыка». 39. Актава. 43. Коца. 44. Бада.

Даты | Падзеі | Людзі

1893 год — нарадзілася Канстанцыя Буйло (сапр. Калечыц Канстанцыя Антонаўна), беларуская паэтка, заслужаны дзеяч культуры Беларусі. Першую кнігу паэтэсы «Курганная кветка» адрэдагаваў Я. Купала. Аўтар кніг паэзіі «Май», «Світанне», «На адроджанай зямлі», зборнікаў вершаў для дзяцей, п'ес. У сваёй творчасці шырока выкарыстоўвала фальклорныя матывы, вобразы народнай міфалогіі. Многія вершы пакладзены на музыку (адна з папулярных песень — «Люблю наш край»). Памерла ў 1986 годзе.

1939 год — 75 гадоў таму нарадзіўся (вёска Качаны Мядзельскага раёна) Васіль Пятровіч Шаранговіч, беларускі графік, педагог, прафесар (1981), заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі (1978), заслужаны дзеяч культуры Польшчы (1986), народны мастак Беларусі (1991). У 1967–1998 гадах выкладаў у Беларускай акадэміі мастацтваў (у 1986–1989-м — прарэктар, у 1989–1997 — рэктар). Працуе ў галіне кніжнай і станковай графікі. Аформіў кнігі «Мая Беларусь» Т. Хадкевіча, «Салавей» З. Бядулі, «Сорак трэці» І. Навуменкі, «Новая зямля» Я. Коласа і іншыя. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1986).

1894 год — 120 гадоў таму нарадзіўся (вёска Трабы Ашмянскага павета Віленскай губерні, цяпер Іўеўскі раён Гродзенскай вобласці) вядомы беларускі мовазнавец і педагог Пятро Якаўлевіч Юргелевіч. Удзельнічаў у Першай сусветнай і Грамадзянскай войнах. Скончыў БДУ (1925), працаваў сакратаром Мсціслаўскага райкама партыі (1925), рэдактарам Калінінскай акруговай газеты «Наш працаўнік» (1926. З 1930 года — вучоны сакратар Інстытута мовазнаўства АН БССР і па сумяшчальніцтве выкладчык Мінскага вышэйшага педагагічнага інстытута (1933 –1936). Даследаваў пытанні ўнармавання беларускай літаратурнай мовы, рэдагаваў асобныя выпускі беларускай навуковай тэрміналогіі, удзельнічаў у падрыхтоўцы інструкцый і анкет па збіранні дыялектнай лексікі. У лістападзе 1935 г. па беспадстаўным абвінавачанні ў буржуазным нацыяналізме быў асуджаны на 5 гадоў. Адбыўшы пакаранне, працаваў выкладчыкам Гомельскага педагагічнага інстытута (1940–1941), а з 1944 г. да выхаду на пенсію (1969) — у Магілёўскім педагагічным інстытуце дацэнтам кафедры беларускай мовы, 18 гадоў загадваў ёю (1944–1962). Аўтар арыгінальнага і наватарскага для таго часу вучэбнага дапаможніка «Нарыс сучаснай беларускай мовы з гістарычнымі каментарыямі. Фанетыка, графіка і правапіс, лексіка і фразеалогія» (1958, 2-е выд. 1961). Памёр у 1973 г.

Было сказана

Рыгор ШЫРМА, харавы дырыжор, фалькларыст, грамадскі і музычны дзеяч:

«Не будзем адказваць лаянкай, а пастараемся адказаць па сутнасці».

СЁННЯ

Месяц

Поўня 16 студзеня.
Месяц у сузор'і Рака.

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск	— 9.21	17.17	7.56
Віцебск	— 9.17	17.00	7.43
Магілёў	— 9.11	17.07	7.56
Гомель	— 9.00	17.11	8.11
Гродна	— 9.35	17.33	7.58
Брэст	— 9.28	17.41	8.13

Імяніны

Пр. АБРАЗАННЕ ГАСПОДНЕ.
К. Марыны, Ніны, Гіляра, Фелікса.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

ЗАЎТРА



УСМІХНЕМСЯ

— Ма-а-ама-а!.. Я знайшла ката!
— Дачка... Табе 35, мужа шукай!

Сёння на працы 1,5 гадзіны не было інтэрнэту.
Выпілі ўвесь чай, разгаварыліся, пазнаёміліся...

Адэса.
— Сямён Маркавіч, а вы сваю жонку кахаеце?
— Зразумела!.. Чым яна горшая за іншых?

Сёння быў у зубнога ўрача. Доктар сказаў, што мне трэба карыстацца зубной пастай «29» і час падумаць аб пасце «28» ці нават «27»...


caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), В. КЛЮЧНІК (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, С. ПРОТАС (першы намеснік дырэктара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

НАШ АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 21, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значкам, носяць рэкламны характар.
Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 22.801. Індэкс 63850. Зак. № 250.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 13 студзеня 2014 года.